

# «АРГАНІЗОЎВАЙЦЕ, НАПРУЖВАЙЦЕ, ПРАДАВАЙЦЕ»

**Якія задачы Прэзідэнт паставіў перад кіраўніком урада**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ВЕРАСНЯ 2025 г. СЕРАДА № 184 (30572)

# ЯКАСНА І ВЕЛЬМІ СМАЧНА!

Даўно даказана, што асновай моцнага здароўя, добрых працаздольнасці і самаадчування дзяцей служыць правільнае харчаванне. Таму пытанне ўдасканалення сістэмы харчавання ў школах, дзіцячых садках, інтэрнатах, цэнтрах рэабілітацыі і аздараўленчых лагерах паслядоўна вырашаецца на дзяржаўным узроўні. Так, з 1 кастрычніка грашовыя нормы расходаў на харчаванне будуць павялічаны на 5 % для навучэнцаў агульнаадукацыйных школ, дашкольных і іншых устаноў адукацыі. Гэты крок будзе зроблены з адзінай важнай мэтай — умацаванне здароўя падрастаючага пакалення і забеспячэнне дзяцей збалансаваным, якасным харчаваннем.

СТАР. 12–13



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**У школе дзецям прывіваюць культуру харчавання і прапаноўваюць стравы нацыянальнай кухні**

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

СВАЕ МЕТРЫ І ЭЛЕКТРАКАР НА ПРЫВАБНЫХ УМОВАХ 6



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ

## Ініцыятыва вітаецца!



*Аб тым, што толькі разам мы можам зрабіць сваю любімую Беларусь яшчэ больш прыгожай і ўтульнай, пастаянна гаворыцца на найвышэйшым узроўні. Адзін з самых эфектыўных спосабаў далучыцца да гэтай важнай справы — грамадзянскія ініцыятывы. Іх сутнасць у тым, каб не толькі прапанаваць дзяржаве рэалізаваць нейкі сацыяльна значны праект у вёсцы ці ў гарадскім двары, але і самім паўдзельнічаць у яго ажыццяўленні, у тым ліку фінансава.*

*Нядаўна размова пра гэта ішла падчас наведвання Прэзідэнтам рэканструяванага комплексу «Лошыцкі» ў сталіцы. Тады старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў далажыў кіраўніку дзяржавы ў тым ліку і аб гэтым новым кірунку работы — сёлета ў Мінску пры ўдзеле гараджан было рэалізавана 14 такіх праектаў.* ***«Трэба гэтым займацца. Мабілізоўваць, аб'ядноўваць, угаворваць, прасіць, прапаноўваць і патрабаваць ад людзей. Кожны павінен хоць невялікую капейку разам з дзяржавай*** *(укласці ў добраўпарадкаванне. —* ***«Зв.»****), — арыентаваў Аляксандр Лукашэнка. —* ***Неабходна гэтым займацца, бо гэта для людзей».***

*Тэма актуальная не толькі для Мінска — рэалізацыя грамадзянскіх ініцыятыў набірае тэмпы па ўсёй краіне. На старонках «Мясцовага самакіравання» ў новай рубрыцы «Ініцыятыва вітаецца» мы будзем расказваць пра самыя цікавыя і карысныя з іх. Гэтыя публікацыі, мяркуем, паслужаць добрым прыкладам для тых, хто хоча зрабіць родныя мясціны больш утульнымі і зручнымі для жыцця.*

***А першая публікацыя новай рубрыкі — пра чатырнаццатую па ліку грамадзянскую ініцыятыву, рэалізаваную ў сталіцы — у самым яе цэнтры, на бульвары Мулявіна.***

СТАР. 10

ISSN 1990 — 763X

# «АРГАНІЗОЎВАЙЦЕ, НАПРУЖВАЙЦЕ,

## Якія задачы Прэзідэнт паставіў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка рыняў з дакладам Прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына. Галоўная тэма — работа эканомікі за восемь месяцаў. Кіраўнік дзяржавы часта нагадвае, што галоўнае пытанне для ўрада — эканамічнае развіццё краіны, і сам уважліва ўнікае ва ўсе аспекты.



Фота БелТА.

«Перад размовай з вамі запытаў інфармацыю пра «касякі» ўрада — ВУП 101,6 % (тэмп росту. — **«Зв.»**), але прасядаюць галоўныя галіны.

**І мяне што здзіўляе: я вам даручыў заняцца непасрэдна прамысловасцю. Добра, па сельскай гаспадарцы вы, магчыма, перасягнеце год... Ураджайнасць вышэйшая і гэтак далей па дзевяці месяцах. Палічым, паглядзім... Але ў нас адставанне па сельскай гаспадарцы, няхай там і доля працэнта. І адставанне па прамысловасці. Прамысловасць — ваша пытанне, пытанне нумар адзін. Арганізоўвайце, напружвайце, прадавайце, бо экспарт у нас, што больш за ўсё напружвае, прасеў на 2,5 %», — пачаў размову крытычна кіраўнік дзяржавы.**

Аляксандр Турчын удакладніў, што прасеў экспарт тавараў, аднак разам з экспартам паслуг тэмп росту экспарту складае 101,2 %. «Але і тавары трэба падцягваць. Бо тавары — гэта людзі, гэта працоўныя калектывы, гэта заработная плата», — заўважыў Прэзідэнт.

**Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што на складах застаюцца запасы, якія не прададзены. Ён прывёў у прыклад масла, якога колькі выпрабляецца, столькі і прадаецца, а тыя запасы, якія ўжо былі, так і застаюцца на складах. Паводле слоў Прэзідэнта, напрыклад, у Кітаі нашу прадукцыю гатовы купляць па сусветных цэнах. «Так трэба паглядзець вакол. Гэта ж не справа, у свеце народ галадае, а мы не ўсё можам**

**Даслоўна**

# ЭКАНОМІКА РАСЦЕ, ПРАГРЭС ЁСЦЬ,

## Аляксандр Турчын расказаў журналістам падрабязнасці даклада

### АБ «ЧОРНЫХ ЛЕБЕДЗЯХ», ЯКІМ НЕ ТРЭБА ПАДДАВАЦЦА

«Адназначна ахарактарызаваць бягучы стан эканомікі будзе складана, бо насамрэч мы працуем у вельмі няпростых умовах. Сказаць, што ў нас няма праблем, — гэта будзе няправільна. Але тым не менш мэта ўрада ў бягучым моманце — зрабіць так, каб у нас быў збалансаваны рост эканомікі. Каб у нас аб'ёмы вытворчасці не суправаджаліся ростам складскіх запасаў, дэбіторскай запазычанасці. Каб наша эканоміка працавала эфектыўна. Можа быць, гэта незаўважна, але ўрад вельмі эфектыўна працуе ў гэтым кірунку, мы працуем з нашымі партнёрамі па ЕАЭС, з партнёрамі ў Расійскай Федэрацыі. Ёсць шэраг дамоўленасцяў, якія дазваляюць нам з аптымізмам глядзець наперад», — падкрэсліў Прэм'ер-міністр. Ён прызнаў, што ёсць праблемы ў асобных прадпрыемстваў, нават у асобных галін. «Мы ва ўрадзе прынялі рашэнне паглядзець на гэтыя праблемы сістэмна. Мы прааналізавалі шэраг прадпрыемстваў, якім у свой час па рашэнні кіраўніка дзяржавы была аказана дзяржаўная падтрымка. Прыемна, што для большасці гэта падтрымка дала станоўчы эфект — прадпрыемствы працуюць, выконваюць свае абавязацельствы. Але ёсць шэраг тых, якім падтрымка выніку не прынесла», — адзначыў ён. Цяпер урад прапрацоўвае стратэгічныя рашэнні, якія датычацца перш за ўсё канцэрнаў «Беллеспаперпрам» і «Беллегпрам», і простых рашэнняў тут няма. Па словах Прэм'ер-міністра, на працягу года плануецца ўнесіць адпаведныя прапановы на ўзровні кіраўніка дзяржавы.

Што датычыцца знешнеэканамічнай дзейнасці, па выніках сямі месяцаў тэмп росту экспарту тавараў і паслуг — 101,2 %. «Але экспарт таксама павінен быць эфектыўным, не трэба прадаваць тавар сабе ва ўрон. Мы павінны зарабляць на экспарце нашых тавараў і паслуг», — заўважыў Аляксандр Турчын. Па яго словах, прагрэс у гэтым кірунку ўжо ёсць. Але дастаткова і праблем: аптымізму не дадаюць санкцыі, недружалюбныя крокі суседзяў, напрыклад нядаўняе закрыццё Польшчай граніц. «Мы кожны дзень жывём у нейкіх чаканнях чарговых, як я кажу, «чорных лебедзяў». Мне здаецца, што спакойнага жыцця ўжо дакладна не будзе. Будуць узнікаць тыя ці іншыя праблемы, але наша задача з імі спраўляцца. Задача ўрада — не дапусціць ніякага абвалу і забяспечваць збалансаваны рост. Нельга забяспечваць рост ва ўрон іншым паказчыкам, асабліва эканамічным», — дадаў кіраўнік урада.

### АБ ЦЭНАЎТВАРЭННІ, ЯКОЕ ПАВІННА БЫЦЬ СПРАВЯДЛІВЫМ

Журналісты таксама закранулі пытанне справядлівага цэнаўтварэння — задачу, якую Прэзідэнт пастаянна ставіць перад урадам. Аляксандр Турчын заўважыў, што класічнае рынкавае паняцце раўнаважкай цаны шмат у чым тоесна таму, што кажа Прэзідэнт аб формуле справядлівай цэны. Па словах Прэм'ер-міністра, вельмі складаная задача знайсці такую цану, якая б задавальняла і вытворцу, і прадаўца, і пакупніка. Ён нагадаў, што ў красавіку ўрадам было прынята рашэнне па карэкціроўцы парадку рэгулявання цэн вытворцаў. Ключавая мэта гэтага рашэння — даць магчымасць айчынным вытворцам устанавіць станоўчы ўзровень рэнтабельнасці вытворчасці сваёй прадукцыі. На прыкладзе прадпрыемстваў мяса-малочнай галіны ў Слуцку Аляксандр Турчын расказаў, што там узровень рэнтабельнасці дасягнуў 6 %. «Людзі вывелі з зоны адмоўных значэнняў вытворчасць сваёй прадукцыі і выпрабляюць яе з невялікай рэнтабельнасцю. Гэта адназначна справядлівае рашэнне. Прычым узровень рэнтабельнасці ў 6 % таксама не вельмі

# ПРАДАВАЙЦЕ»

## перад кіраўніком урада

**прадаць. Калі масла не купляюць, дык трэба менш яго вырабляць», — заклікаў кіраўнік дзяржавы.**

Пры гэтым ён адзначыў, што аб'ёмы вытворчасці свініны аднаўляюцца недастатковымі тэмпамі. «Па свініне калі мы выраўняемся?» — спытаў Прэзідэнт. Аляксандр Турчын далажыў, што ўжо з верасня пачалося запаўненне скота-месцаў. Па Мінскай вобласці ўжо за верасень рост прадукцыйнасці свініны дасягне 136 %.

«Гэта ўсё зразумела. Але трэба віцэ-прэм'ера, які адказвае за сельскую гаспадарку, Шулейку ўзяць на жорсткі кантроль. Пакуль выніку яго дзейнасці я не бачу. А гэта яго пытанні: у вытворчасці — кантроль (ён павінен бачыць), у продажы — экспарт. Віцэ-прэм'ер за гэта адказвае», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на дрэваапрацоўку і лёгкую прамысловасць, па гэтых сферах таксама ёсць пытанні. Пры гэтым, заўважыў ён, ёсць і станоўчыя моманты.

«У гэтыя складаныя часы нялёгка працаваць. Але тым не менш я хачу, каб вы ведалі, каб не было тут ніякай рэўнасці, я папрасіў былога прэм'ера (былых жа не бывае, малады чалавек, адукаваны, дасведчаны), каб ён стварыў групу ў сябе ў Нацыянальным банку.

**А такія людзі ёсць — разумныя, адукаваныя, дасведчаныя ў эканоміцы. Трэба, каб яны дапамагалі паралельна з Камітэтам дзяржкантролю (не зусім яго функцыя, ведаеш, чым ён павінен займацца), каб яны мяне інфармавалі, аналізавалі сітуацыю ў эканоміцы. А па грошах жа відаць усё, ты ж эканаміст, разумееш, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.**

— Таму без усялякіх крыўд. Я Галоўчанку папрасіў: «Сфарміруй мне такую групу ў Нацыянальным банку, ты будзеш яе кіраўніком і аб'ектыўна мне павінен аналізаваць і дакладваць». Бо маё ўражанне — гэта адно, а то спецыялісты. Гэта, вядома, не закрытая будзе інфармацыя, прэм'ер павінен яе бачыць і будзе бачыць».

Аляксандр Лукашэнка таксама закрануў пытанне пералёту праз Беларусь прыватных авіякампаній з Казахстана. «Нашы самалёты там не абслугоўваюцца, не запраўляюцца. Расійскія, даклада такія, яны запраўляюць і абслугоўваюць, беларускія — не. Трэба выпраўляць сітуацыю. Вось цяпер на асаблівы кантроль пытанне паставілі», — падкрэсліў ён.

**Па словах кіраўніка дзяржавы, у Беларусі ў гэтай сітуацыі павінны быць дакладныя прыярытэты. «Нам трэба абараняць свае інтарэсы. Калі яны супадаюць з іншымі краінамі, добра. Не супадаюць — шукаем кампраміс. То-бок па-чалавечы. Таму што Казахстан нам не чужая краіна. Гэта краіна, з якой мы ў ЕАЭС. Мы заўсёды мелі добрыя адносіны з Казахстанам. Псаваць гэтыя адносіны не трэба. Але інтарэсы трэба абараняць, — заявіў Прэзідэнт.**

АКЦЭНТЫ

### ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА 23 ВЕРАСНЯ ЗАСЛУХАЎ ДАКЛАД СТАРШЫНІ БРЭСЦКАГА АБЛВЫКАНКАМА ПЯТРА ПАРХОМЧЫКА

Абмяркоўваўся ход палявых работ, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Дарэчы, у рэгіёне сёлета разлічваюць атрымаць каравай збожжавых (разам з рапсам) больш за 2 мільёны 100 тысяч тон — гэта значна перасягне ўзровень мінулых гадоў, як і было абяцана вобласцю.

Большая частка размовы была прысвечана ўраджаю 2026 года — сяўба азімых збожжавых, забяспечанасць угнаеннямі.

Аляксандр Лукашэнка ў размове з Пятром Пархомчыкам закрануў і тэмы прамысловасці. Раней, прызначаючы яго кіраўніком вобласці, Прэзідэнт даручаў не сыходзіць ад пытанняў галіны, бачыць, што адбываецца ў прамысловасці і падключацца да пытанняў, якія складана вырашаюцца, у тым ліку працаваць з дырэктарамі, дапамагаць маладому міністру.



У ходзе даклада абмяркоўвалася, у прыватнасці, і работа флагманаў беларускай прамысловасці — МТЗ, «Гомсельмаш», Беларускага металургічнага завода, буйных прадпрыемстваў Брэстчыны.

Асобна спыніліся на рабоце праблемных прадпрыемстваў.

Яшчэ адзін блок пытанняў даклада — узаемадзеянне з кітайскімі партнёрамі, з якімі ў рэгіёна ёсць цэлы шэраг перспектыўных праектаў.

*Дарэчы, сёлета ўпершыню ў гісторыі Брэсцкая вобласць перасягнула мяжу па намалоце 1,5 млн т збожжа без кукурузы і рапсу. Сярэдняя ўраджайнасць на палях Брэсцкай вобласці сёлета складае 45,1 ц/га. Гэта на 7,8 ц/га больш за леташні ўзровень.*

### КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ ЎЧОРА ТАКСАМА ЗАСЛУХАЎ ДАКЛАД КІРАЎНІКА СПРАЎ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ ЮРЫЯ НАЗАРАВА

Як паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара, Прэзідэнт падрабязна цікавіўся, як ідуць справы ў сельскагаспадарчым сектары ў структуры кіравання справамі, а таксама ходам работ па ўзвядзенні і рэканструкцыі асобных аб'ектаў — сельгастэхнікі ў Шклове, малакаперапрацоўчага завода і камбікормавага завода.



Асобна спыніліся на рабоце сельгаспрадпрыемства «Купалаўскае». Было даложана, што ўсе сельскагаспадарчыя работы ідуць у адпаведнасці з графікам і з улікам цяперашніх пагодна-кліматычных умоў.

Прэзідэнту таксама было даложана аб ходзе работ у гаспадарцы «Агра-Ляскавічы». Гаворка ішла аб будаўніцтве малочнатаварнага комплексу і вытворчасці ЛВЛ-бруса.

# АЛЕ І ПРАБЛЕМ ХАПАЕ

## і далейшыя планы ўрада

дазваляе весці, напрыклад, інвестыцыйную дзейнасць. Але мы разумеем, што ў бягучым моманце гэтага будзе дастаткова», — сказаў кіраўнік урада. Разам з тым звярнуў увагу ён, у структуры цаны ёсць і фактар росту заробкаў. «У нас рост заработнай платы ў рэальным выяўленні каля 10 %. У намінальным — значна вышэйшы. Але ў структуры сабекошту кожнага тавару ёсць зарплата, — адзначыў Аляксандр Турчын. — На мой погляд, знайсці гэты баланс, раўнавагу, справядлівасць — галоўная задача ўрада. Сёння ён кантралюе працэсы, якія адбываюцца ў краіне».

### АБ ДАПАМОЗЕ ФЕРМЕРАМ З-ЗА НЕЎРАДЖАЮ ЯБЛЫКАЎ

Паводле слоў Прэм'ер-міністра, нельга, каб вытворца вырабляў прадукцыю сабе ва ўрон. Аляксандр Турчын прывёў у прыклад праблему неўраджаю яблыкаў, звязаную з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я сёлета. «Але ёсць выдаткі, пастаянныя выдаткі. Нельга не апрацоўваць сад, не даглядаць яго. Гэта значыць, ты выдаткі нясеш тыя ж, што і ў мінулым годзе, але размяркоўваеш іх не на 3 тысячы тон, а на 300 кілаграм. Таму сабекошт яблыка, відавочна, не можа быць такі, як летась, — адзначыў Прэм'ер-міністр. — Мы разумеем, што агулам у краіне аб'ём вытворчасці яблыкаў каля 40 % ад узроўню мінулага года. Урад прыняў усе рашэнні. У тым ліку мы цяпер запускаем для фермераў банкаўскі прадукт. Для таго каб тыя, у каго складаная сітуацыя са сваім бізнесам, маглі да наступнага года ўзяць на камфортных умовах крэдытныя рэсурсы, якія б дапамаглі дацягнуць да наступнага ўраджаю».

### АБ ЗБАЛАНСАВАНАСЦІ ЭКАНОМІКІ І ЭКСПАРЦЕ ПАСЛУГ

У цэлым, адзначыў Аляксандр Турчын, калі глядзець на глабальныя, геапалітычныя ўмовы, у нас усё нават вельмі ня дрэнна. «Эканоміка расце. Можа, не такімі тэмпамі, як хацелася. Але, на мой погляд, да нейкай збалансаванасці мы прыйшлі», — сказаў Прэм'ер-міністр. Ён адзначыў работу аграрыяў, якія сёлета сабралі годны — адзін з самых высокіх у гісторыі — ураджай збожжавых. «Расце жывёлагадоўля. Прадукты будуць, перапрацоўка ідзе, экспарт ёсць», — рэзюмаваў кіраўнік урада.

Складанай задачай Аляксандр Турчын назваў дыверсіфікацыю паставак. Хутка вырашыць яе немагчыма, але ўрад працуе над гэтым пытаннем. Тэмп росту экспарту тавараў і паслуг сёлета складае 101,2 %. «Не можа не радаваць апераджальны тэмп росту экспарту паслуг. Структура эканомікі ў развітых краінах мае на ўвазе ўдзельную вагу паслуг у ВУП больш, чым у Беларусі», — сказаў Прэм'ер-міністр. У гэтым плане кіраўнік урада адзначыў перспектывы развіцця такіх кірункаў, як турызм або IT-сектар, якім на дзяржаўным узроўні ўдзяляецца вялікая ўвага.

### ДАРУЧЭННІ ПРЭЗІДЭНТА НА КАНТРОЛІ

Учора Аляксандр Турчын правёў рабочую сустрэчу па пытанні выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы аб якасным абслугоўванні насельніцтва, якое пражывае ў сельскай мясцовасці, і распрацоўцы комплекснай сістэмы гандлёвага абслугоўвання насельніцтва ў цэлым па рэспубліцы.

Валерыя СЦЯЦКО.

НА КАНТРОЛІ

# КОМПЛЕКСНАЯ ЗАДАЧА ПАТРАБУЕ СУМЕСНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

## У Савеце Рэспублікі расказалі аб насычэнні ўнутранага рынку айчыннымі таварамі



Фота БелТА.

**Днямі ў Савеце Рэспублікі разгледзелі комплекс пытанняў, звязаных з рэалізацыяй прадукцыі беларускай вытворчасці ў гандлёвых сетках краіны. Да пытання забеспячэння грамадзян якаснымі і разнастайнымі таварамі ў нашай краіне падыходзяць сістэмна. Так, напрыклад, у 2020 годзе была прынятая пастанова МАРГ № 74 «Аб пераліку тавараў», якая загадвае абавязковасць наяўнасці пэўнай колькасці найменняў тавараў у гандлёвых аб'ектах. У жніўні мінулага года кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ «Аб падтрымцы арганізацый спажывецкай каапераці». На нарадзе аб эфектыўнасці сістэмы гандлёвага абслугоўвання насельніцтва ў маштабах Беларусі 26 жніўня бягучага года Аляксандр Лукашэнка падняў цэлы пласт пытанняў — ад работы крам на вёсцы да кантролю якасці прадукцыі, а таксама паставіў канкрэтныя задачы, у вырашэнні якіх павінны быць задзейнічаны ўсе.**

Пытанне наяўнасці айчыннай малочнай, мясной прадукцыі, садавіны і агародніны знаходзіцца на асаблівым кантролі Савета Рэспублікі. На сустрэчы 22 верасня прысутнічалі кіраўнікі буйных рытэйлаў. Гаворка ішла пра тое, што гандлёвыя сеткі павінны больш шчыльна і актыўна супрацоўнічаць з вытворцамі, роўна як і вытворцы павінны ісці насустрач гандлёвым сеткам.

Як паведамілі ў Савеце Рэспублікі, за першае паўгоддзе ўдзельная вага тавараў айчыннай вытворчасці ў рознічным тавараабароце скарацілася на 3,3 працэнтнага пункта і складае цяпер 54,6 %. У цэлым рознічны гандаль дынамічна развіваецца, тэмп росту па выніках 8 месяцаў склаў 108,5 %.

На сустрэчы падкрэслілі, што пытанні насычэння ўнутранага рынку таварамі айчыннай вытворчасці — гэта комплексная задача, якая патрабуе сумесных дзеянняў дзяржавы, бізнесу і грамадства. Пад бізнесам разумеюцца як суб'екты гандлю, так і вытворцы, гэта значыць, суб'екты гаспадарання павінны знаходзіць узаемапрымальныя рашэнні ў рамках дзеючага заканадаўства. Што датычыцца дзяржавы, яна ставарае прававыя ўмовы, удасканальвае рэгулятарыку для таго, каб спажыўцы мелі права выбару ў гандлёвых сетках.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** падкрэсліла, што грамадзяне павінны быць забяспечаны прадуктамі харчавання і таварамі народнага харчавання ва ўсіх кутках краіны, незалежна ад рэгіёна: «З улікам таго, колькі нашы прадпрыемствы сёння выпускаюць прадукцыі, у нашых людзей павінна быць усё».

Савет Рэспублікі як палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва таксама робіць свой унёсак ва ўдасканаленне рэалізацыі тавараў на ўнутраным рынку і ва ўдасканаленне гандлёвай палітыкі суб'ектаў гаспадарання. Так, у ліпені ў Зэльве прайшла сустрэча з дэпутатамі Гродзенскай і Брэсцкай абласцей усіх узроўняў, на якой выступілі рэгулятары — прадстаўнікі МАРГ, прадстаўнікі Белкаапсаюза. Яны дзяліліся сваім бачаннем перспектыў развіцця гандлю, у тым ліку ў сельскай мясцовасці. На гэтым тыдні адбудзецца аналагічная сустрэча з прадстаўнікамі дэпутацкага корпуса Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей, дзе таксама будзе разгледжаны шырокі спектр пытанняў, звязаных з гандлёвым абслугоўваннем насельніцтва, у тым ліку ў сельскай мясцовасці.

Па даручэнні кіраўніка дзяржавы Савет Рэспублікі на пастаяннай аснове праводзіць маніторынг гандлёвых сетак ва ўсіх рэгіёнах. У асноўным вынікі маніторынгу паказваюць, што гандлёвыя аб'екты выконваюць усе нормы заканадаўства. Дзесьці часам узнікаюць кропкавыя праблемы, але яны звязаны не з недасканаласцю заканадаўства, а з нядбайнасцю мясцовых кіраўнікоў або загадчыкаў магазінаў. Напрыклад, недзе ўзнікла нехватка пэўнага тавару, яго не падвезлі са склада. У такіх выпадках пытанні вырашаюцца аператыўна, і прыходзіць адказ аб тым, што пытанне вырашана паспяхова: тое, чаго не хапала, падвезена і дэфіцыту не назіраецца.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# АКТЫЎНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У АКРУГАХ, УЗАЕМАДЗЕЯННЕ СА СМІ

## У Бабруйску акрэслілі прыярытэты ў рабоце дэпутатаў



Фота прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.

**Выезды, сустрэчы і мерапрыемствы, прыёмы грамадзян — падобны фармат працы ў акругах прыярытэтны для дэпутатаў. Аб гэтым ішла размова ў Бабруйску на сустрэчы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ад Магілёўскай вобласці з кіраўніцтвам Магілёўскага аблвыканкама. На нарадзе таксама абмеркавалі вынікі супрацоўніцтва дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ад Магілёўскай вобласці з кіраўніцтвам і актывам рэгіёна.**

— Нашы дэпутаты актыўна займаюцца заканатворчай дзейнасцю ў парламенце, — падкрэсліў напачатку размовы **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА.** — За папярэднія сесіі было прынята 95 законапраектаў. Важна адзначыць, што пры распрацоўцы законаў мы кіруемся прынцыпамі адлюстравання інтарэсаў нашых выбаршчыкаў.

Як адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА,** задачы, якія стаяць перад прадстаўнічай уладай, выразна абазначаны кіраўніком дзяржавы. Галоўнае — гэта людзі і справядлівае стаўленне да іх.

— Работа дэпутатаў павінна быць рэальнай, эфектыўнай і прыносіць канкрэтны вынік, — падкрэсліў ён. — Што датычыцца дэпутацкай дзейнасці непасрэдна ў Магілёўскай вобласці, неабходна звярнуць увагу на стварэнне дадатковых умоў для павелічэння інвестыцыйнай прывабнасці рэгіёна, прыцягнення і кансалідацыі працоўных рэсурсаў. Рэгіён гатовы стаць пляцформай для апрабіравання законаў, якія будуць служыць на карысць яго ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Сёння Магілёўшчына прадстаўлена ў Палаце прадстаўнікоў 13 дэпутатамі, з якіх чатыры праінфармавалі ўдзельнікаў нарады аб сваёй рабоце на карысць Магілёўскай вобласці і парламентарызму ў Беларусі.

Як паведаміў у сваім выступленні **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА,** у сваёй парламенцкай дзейнасці ён прытрымліваецца прынцыпу, сфармуляванага Прэзідэнтам, — асновай работы павінна быць справядлівае стаўленне да людзей.

Па словах парламентарыя, эфектыўнымі і папулярнымі формамі дэпутацкай дзейнасці з'яўляюцца сустрэчы з працоўнымі калектывамі, удзел у рабоце інфармацыйных груп, дабрачынныя акцыі і гэтак далей.

**Член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Вольга ЖУК** адзначыла, што сустрэчы ў калектывах — важная крыніца інфармацыі для таго, каб зрабіць зрэз настрояў грамадства. Эфектыўным спосабам для вызначэння сацыяльнага клімату яна лічыць нефармальныя стасункі з прадстаўнікамі прафесій, якія з'яўляюцца праваднікамі грамадскага меркавання, — таксістамі, работнікамі гандлю і гэтак далей.

**Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Антон КАРАНКЕВІЧ** падзякаваў мясцовым органам улады за канструктыўнае ўзаемадзеянне, якое дапамагае вырашыць большасць пытанняў, што гучаць на прыёмах грамадзян.

— Шмат з іх датычацца выкарыстання электрычнасці для ацяплення і гарачага водазабеспячэння, — заўважыў ён. — Папулярным фарматам з'яўляецца разгляд тэм, якія цікавяць жыхароў на выязных пасяджэннях пастаянных камісій, круглых сталах. У працоўных калектывах нярэдка гучаць пытанні па развіцці энергетыкі, рабоце БелАЭС.

— Гэта пляцоўка не проста для інфармавання — тут прайшоў абмен меркаваннямі, свайго роду «зверка гадзіннікаў», — аргументаваў **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Валерый МАЛАШКА.** — Асабліва важна, што мы атрымліваем жывую інфармацыю з месцаў і можам планаваць сваю далейшую дзейнасць на найбліжэйшую перспектыву, фактычна на наступны год.

На нарадзе прагучала новая ініцыятыва ад кіраўніка Магілёўскай вобласці Анатоля Ісачанкі, каб дэпутаты таксама выходзілі з прапановай «Адзін раён — адзін праект». Ігар Сергяенка назваў ідэю слушнай.

— Неабходна прапаноўваць ініцыятывы ў ходзе размовы з нашымі замежнымі партнёрамі і прадстаўнікамі рэспубліканскіх органаў улады, а таксама агучваць канкрэтныя ідэі, якія будуць падтрыманы адпаведным фінансаваннем з боку вобласці. Гэта ўжо новы ўзровень, я сказаў бы — новы рубеж як у ведах, так і ў кампетэнцыях нашых дэпутатаў, — рэзюмаваў ён.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*г. Бабруйск*

УРАЖАННІ

# «УНІКАЛЬНЫ І НЕПАЎТОРНЫ»

## Палац Незалежнасці зноў прымаў гасцей

На экскурсіі пабывала звыш 80 чалавек — фіналісткі Нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь — 2025» і іх бацькі, супрацоўнікі дзяржаўнай установы адукацыі «Цэнтр «Нацыянальная школа прыгажосці», прадстаўнікі ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал», які браў удзел у падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемства.



Фота БелТА.

Сустрэлі гасцей па традыцыі ў Зале ўрачыстых цырымоній. Тут коратка расказвалі пра гісторыю стварэння палаца. Тэрміны будаўніцтва галоўнай афіцыйнай пляцоўкі краіны былі скарочаныя Прэзідэнтам з 57 месяцаў да 30. Ужо ў кастрычніку 2013-га Палац Незалежнасці адчыніў свае дзверы для першых высокіх гасцей, а некалькі гадоў таму па распараджэнні Аляксандра Рыгоравіча — і для звычайных беларусаў.

Увагу экскурсантаў звярнулі і на той факт, што ўвесь палац пабудаваны беларускімі спецыялістамі. Гэты праект для ўсёй будаўнічай галіны краіны стаў сапраўдным іспытам і да гэтага часу застаецца школай кампетэнцый для многіх спецыялістаў. Падчас экскурсіі гасцей падрабязна пазнаёмілі з гісторыяй і сімволікай беларускай дзяржаўнасці, паказалі залы, дзе прымаюцца найважнейшыя рашэнні, а таксама экспазіцыю з падарункамі ад замежных дэлегацый.

Для **пераможцы Нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь — 2025» Алены КУЧАРУК** экскурсія па сімвале беларускай дзяржаўнасці стала прыемнай нечаканасцю. «Уражваюць не толькі агульныя маштабы Палаца Незалежнасці, але і атмасфера, у якую трапляеш, — веліч спалучаецца з неверагоднай прыгажосцю, беларускімі матывамі. Гаворачы аб залах, якія нам удалося наведаць, адзначу, што кожны з іх унікальны і непаўторны. У гэтым і ёсць разынака. А ў цэлым, думаю, пабываць тут варта кожнаму беларусу, каб пераканацца: палац неверагодны!»

Прыгажосць у дэталях — пра Палац Незалежнасці, адзначыла **першая віцэ-міс Нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь–2025» Алія КАРОТКАЯ.** «Для мяне вялікі гонар пабываць тут, — падзялілася дзяўчына. — Уразіў незвычайны факт: тэмпература ў палацы — каля 16-18 градусаў цяпла, што, здавалася б, халаднавата, але атмасфера наадварот вельмі прыемная, падбадзёрлівая. Паколькі я жыву ў цэнтры Мінска, даволі часта праязджала раней галоўную афіцыйную пляцоўку ў краіне і нават падумаць не магла, што калі-небудзь апынуся тут. У кожнага з нас ёсць такая магчымасць, трэба толькі зачапіцца за яе!»

**Дырэктар — мастацкі кіраўнік Нацыянальнай школы прыгажосці Беларусі Бажэна ЯРЭМІЧ** ужо не ўпершыню пабывала ў рэзідэнцыі Прэзідэнта, аднак гэта афіцыйная цырыманіяльная пляцоўка застаецца лідарам па ўражаннях, прызналася суразмоўніца: «Ад экскурсіі застаецца прыўзняты ўзровень патрыятызму, любові да сваёй краіны, да беларусаў, якія стварылі Палац Незалежнасці. Пасля яго наведвання яшчэ больш хочацца тварыць на карысць роднай Беларусі».

**Яна ВАЛАСАЧ.**

НАПЯРЭДАДНІ

# БЕЛААЗЁРСК РЫХТУЕЦЦА ДА «ДАЖЫНАК»

## Добраўпарадкаванне, новыя сацыяльныя аб'екты і перспектыўныя праекты

Белаазёрск, малады горад з цікавай гісторыяй і працавітай душой, сёлета стане сталіцай абласных «Дажынак» на Брэстчыне. Да свята горад літаральна абнавіўся: тут з'явіліся новыя культурныя і спартыўныя аб'екты, абноўлены сацыяльныя ўстановы, упарадкаваны вуліцы і двары. Аднак «Дажынкі» — гэта не толькі пра навядзенне парадку і рамонт фасадаў. Гэта, перш за ўсё, сімвал павагі да працы, ушанаванне традыцый і сведчанне таго, што развіццё рэгіёна немагчыма без удзелу людзей, якія жывуць тут і самі ствараюць сваю будучыню.



### АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ ПАДРЫХТОЎКІ

Да абласных «Дажынак» пачалі рыхтавацца яшчэ ў 2024 годзе, калі былі распрацаваны канцэпцыі комплекснага абнаўлення горада. Як адзначыў **старшыня гарвыканкама Уладзімір ПІЛІПЕЦ,** сёлета асноўная ўвага была накіравана на сацыяльныя аб'екты, дваровыя тэрыторыі і стварэнне новых зон адпачынку. Асноўная мэта — зрабіць горад больш зручным, камфортным і сучасным.

Першачарговыя работы закранулі двары на праспекце Міра. Іх пашырылі, уладкавалі паркоўвачныя месцы, устанавілі сістэмы асвятлення і відэаназірання. Значныя перамены адбыліся і на сацыяльных аб'ектах. Дом культуры капітальна рамантуецца — ад даху да ўнутраных памяшканняў, створана сучасная бібліятэчная прастора і абноўлена асноўная зала. Бальніца і паліклініка атрымалі новыя фасады, адрамантаваны харчаблок, добраўпарадкаваны дваровыя тэрыторыі, усталяваны альтанкі. Асаблівая ўвага была ўдзелена бяспецы і камфорту людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

### НОВЫЯ КУЛЬТУРНЫЯ І СПАРТЫЎНЫЯ АБ'ЕКТЫ

Адным з сімвалаў абнаўлення стаў праект на так званым «Чарадзейным» возеры. Тут створана пешаходная зона, дзіцячыя і спартыўныя пляцоўкі, з'явілася каваная фігура Феі — мастацкі сімвал мясцовасці. Для зручнасці жыхароў усталявалі новыя лавы, урны, арганізоўваюцца харчовыя лакацыі.

Важнай падзеяй стане адкрыццё басейна ў аздараўленчым цэнтры «Энергія», які будзе даступны як для тых, хто там адпачывае, так і для жыхароў горада. Прадугледжаны таксама спецыяльныя праграмы для школьнікаў па навучанні плаванню.

Не менш значна для гараджан і абнаўленне стадыёна: на ім з'явілася сучаснае пакрыццё, дадатковыя трыбуны, падтрыбунныя памяшканні, новае асвятленне. На тэрыторыі створана інфраструктура, якая дазваляе праводзіць спаборніцтвы высокага ўзроўню.

### ЗМЕНЫ НЕ ТОЛЬКІ ДЗЕЛЯ «ДАЖЫНАК»

Да свята таксама быў закладзены парк Славы і Гонару, дзе размесцяць помнік Герою Савецкага Саюза Іосіфу Вікенцьевічу Свядзінскаму. У далейшым парк будзе развівацца — менавіта тут будуць ушаноўваць памяць людзей, якія зрабілі значны ўнёсак у гісторыю і развіццё Белаазёрска.

Цікавай падзеяй стане адкрыццё помніка крэветцы — арыгінальная ініцыятыва і прыклад супрацоўніцтва грамадскасці, прадпрыемстваў і гарадскіх улад.

Як падкрэсліў Уладзімір Піліпец, жыхары горада актыўна ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы да свята — ад грамадзянскіх ініцыятыў да валанцёрскай дапамогі. «Вядома, пасля «Дажынак» работы па добраўпарадкаванні будуць працягвацца, каб Белаазёрск быў горадам, дзе камфортна жыць, працаваць і адпачываць. Асноўная каштоўнасць — чалавек, і ўсё робіцца дзеля яго дабрабыту», — адзначыў кіраўнік гарвыканкама.

### УРАЖАННІ ЖЫХАРОЎ

Гараджане адзначаюць, што апошнія месяцы сталі для іх асаблівымі: родныя вуліцы, плошча і двары набылі новы выгляд, а разам з тым прыйшло адчуванне, што Белаазёрск атрымаў другое дыханне. Жыхарка Наталля прызнаецца: «Наш Белаазёрск сапраўды змяніўся. Дзеці з радасцю ходзяць у абноўленую школу, дзе не толькі класы, але і спартыўная зала сталі сучасныя і светлыя. Як маці я бачу, што гэта вялікі ўнёсак у будучыню».

Работнік мясцовага прадпрыемства Віктар дадае: «Самы вялікі плюс у тым, што горад стаў больш утульны. Новыя тратуары, асвятленне, добраўпарадкаваныя двары — усё гэта адчуваеш кожны дзень. Сёння проста прыемна прайсціся па вуліцах».

Пенсіянерам таксама падабаюцца змяненні, якія абнавілі Белаазёрск. Мая суразмоўца адзначае, што рамонт паліклінікі, які пачаўся крыху раней, ператварыў будынак установы ў зручны сучасны комплекс, дзе ўсё зроблена для таго, каб наведвальнікі адчувалі сябе больш камфортна: «Цяпер умовы для пацыентаў сталі нашмат лепшыя: усё чыста і светла. Гэта вялікая падтрымка для людзей майго ўзросту».

Для навучэнцаў мясцовага каледжа горад таксама адкрываецца з іншых бакоў і перспектыў. Студэнт Аляксандр цалкам задаволены тым, якая інфраструктура з'явілася для моладзі: «Асабліва важна, што ў горадзе мадэрнізаваўся спартыўны комплекс у цэлым. Мы маем магчымасць не толькі займацца спортам, але і сустракацца з сябрамі. Гэта сапраўдны цэнтр прыцягнення для ўсіх».

Жыхары падкрэсліваюць: Белаазёрск сёння — не проста горад, які падрыхтаваўся да абласнога свята, а месца, дзе хочацца жыць, працаваць і выхоўваць дзяцей. «Дажынкі» сталі каталізатарам станоўчых перамен, якія людзі ацанілі на свае вочы.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ. Фота аўтара.**

# СІНЕРГІЯ ДЛЯ СПРАВЫ

## Фонд фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў у экасістэме развіцця

За апошні год беларускі малы і сярэдні бізнес атрымаў магутны імпульс для развіцця. Прычынай таму стала сінергія паміж Банкам развіцця і Беларускім фондам фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў, якія аб'ядналі намаганні для стварэння адзінай экасістэмы падтрымкі. Пра тое, як гэта працуе, якія вынікі ўжо дасягнуты і што чакае бізнес у будучыні, у эфіры тэлеканала «Беларусь1» распавёў генеральны дырэктар Фонду Пётр Арушаньянц.



### НОВАЯ ЭКАСІСТЭМА: ЧАМУ ГЭТА ВАЖНА ДЛЯ БІЗНЕСУ?

Раней прадпрымальнікі сутыкаліся з праблемай: на розных этапах развіцця ім патрабаваліся розныя віды падтрымкі: ад фінансавых інструментаў да кансалтынгу і дапамогі ў выхадзе на міжнародныя рынкі.

— Сёння дзякуючы аб'яднанню намаганняў Банка развіцця і Фонду для бізнесу адкрываюцца новыя магчымасці, якія адпавядаюць запатрабаванням бізнесу, — адзначае Пётр Арушаньянц.

### ВЫНІКІ: ПАДВОЕНАЕ ФІНАНСАВАННЕ І НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

За першае паўгоддзе 2025-га Фонд падвоіў аб'ёмы фінансавання малога і сярэдняга бізнесу ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Агульная сума падтрымкі склала 15 мільёнаў рублёў, а аб'ём паручыцельстваў вырас у шэсць разоў.

— Мы падвоілі інструменты, таму што попыт значна вырас. Асноўныя напрамкі — вытворчы бізнес, экспарт, паслугі на ўнутраным рынку, турызм і медыцына.

Асаблівая ўвага надаецца рэгіёнам — больш за 70% фінансавання накіравана на падтрымку бізнесу за межамі Мінска.

### ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ І КААПЕРАЦЫЯ: ЯК МАЛЫ БІЗНЕС УБУДОЎВАЕЦЦА Ў БУЙНЫЯ ЛАНЦУЖКІ?

Адзін з ключавых прыярытэтаў — уцягванне малога бізнесу ў вытворчыя ланцужкі буйных прадпрыемстваў. Фонд дапамагае прадпрымальнікам не толькі знайсці партнёраў, але і атрымаць фінансаванне на выгадных умовах.

— Мы пачынаем з інфармацыйнай падтрымкі: дапамагаем малым прадпрыемствам знайсці нішу ў ланцужках буйных кампаній. Калі дамоўленасці дасягнуты, мы даём ільготнае фінансаванне для рэалізацыі кантрактаў.

### БАРАЦЬБА СА СТЭРЭАТЫПАМІ: ПАДТРЫМКА БЕЗ БЮРАКРАТЫІ

Многія прадпрымальнікі дагэтуль лічаць, што атрымаць дзяржаўную падтрымку складана і бюракратычна. Фонд актыўна працуе над тым, каб змяніць гэтае ўяўленне і зрабіць рэсурсы максімальна даступнымі.

— Сёння бізнес можа падаць заяўку на фінансаванне, не наведваючы офіс фонду. Усе неабходныя дакументы загружаюцца праз анлайн-пляцоўку, а праверка і прыняцце рашэння займаюць усяго некалькі дзён. Падпісанне кантракта таксама адбываецца ў электронным фармаце — прадпрымальніку не трэба нікуды ехаць.

Гэты падыход ужо апраўданы на практыцы: першыя праекты паспяхова атрымалі фінансаванне праз цалкам лічбавы дакументаабарот. Такім чынам, Фонд не толькі спрашчае працэс, але і робіць яго максімальна празрыстым і зручным для бізнесу.

— Наша мэта — зрабіць так, каб кожны прадпрымальнік, незалежна ад маштабу бізнесу, мог лёгка атрымаць неабходную падтрымку і развівацца, — рэзюмаваў Пётр Арушаньянц.

# СВАЕ МЕТРЫ

## Беларусбанк запускае дзяржаўную сістэму жыллёвых будаўнічых зберажэнняў

З 22 верасня банк вывеў на рынак новы комплексны прадукт у рамках рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 382 «Аб дзяржаўнай сістэме будаўнічых зберажэнняў», паведамілі ў банку.

Нагадаем, што ў Беларусбанку з ліпеня 2006 года дзейнічала праграма, якая не мела аналагаў на рынку краіны — сістэма будаўнічых зберажэнняў. Яна была альтэрнатывай крэдытаванню на агульных падставах і дазваляла кліентам атрымаць мэтавы крэдыт на больш прывабных умовах.

За час дзейнасці сістэмы будзберажэнняў было адкрыта больш за 50 тысяч жыллёва-накапляльных укладаў, уведзена ў эксплуатацыю больш за 300 тысяч «квадратаў» жылля.



— Сёння на змену лакальнай сістэме будаўнічых зберажэнняў Беларусбанка прыходзіць новы комплексны прадукт з фінансавай падтрымкай у выглядзе прэміі дзяржавы, які з'яўляецца працягам нашай шматгадовай палітыкі па стварэнні даступных фінансавых інструментаў для будаўніцтва і набыцця жылля насельніцтвам, — падзялілася намеснік старшыні праўлення Беларусбанка Святлана Кажэкіна.

У банку адзначылі, што дзяржаўная сістэма будаўнічых зберажэнняў мае шэраг пераваг, сярод якіх больш кароткія тэрміны назапашвання (тры планы па 26, 38 і 62 месяцы); розныя прапорцыі суадносін уласных сродкаў да крэдытных (30/70, 40/60, 50/50); фінансавая падтрымка ў выглядзе штомесячнай выплаты прэміі дзяржавы па ўкладзе ў памеры 10 % стаўкі рэфінансавання Нацбанка (з улікам яе змянення) гадавых.

Варта адзначыць і тое, што прэмія дзяржавы і даходы ў выглядзе працэнтаў па ўкладзе вызваляюцца ад падаходнага падатку.

— Мы чакаем, што новы комплексны прадукт па сваёй запатрабаванасці не будзе саступаць сістэме будаўнічых зберажэнняў, якая раней дзейнічала ў Беларусбанку, — падкрэсліла Святлана Кажэкіна.

У банку дадалі, што ва ўдзельнікаў праграмы ёсць магчымасць ажыццяўляць пераход з аднаго плана назапашвання на іншы больш працяглы, адкрываць неабмежаваную колькасць укладаў, саступаць правы патрабавання па дамове іншым фізічным асобам.

# НЕ НАЗАПАШВАЙ, А КУПЛЯЙ!

## Новы электракар Geely ўжо даступны па льготнай стаўцы

Навіна, якая парадуе аўтааматараў: Беларусбанк пашырае лінейку аўтакрэдытавання — цяпер навінку маркі Geely можна набыць у крэдыт з двухгадовым грэйс-перыядам пад 10 % гадавых, паведамілі ў банку.




У прыватнасці, новы крэдыт даецца на GEELY EX5 — сучасны электрычны красовер, прэзентаваны на рынку Беларусі ў 2025 годзе.

Дарэчы, крэдыт выдаецца на тэрмін да 10 гадоў з магчымасцю датэрміновага пагашэння пад заклад і няўстойку або паручыцельства.

Самае важнае: які працэнт сваіх сродкаў павінен унесці кліент, каб стаць уладальнікам новай «электрычкі» Geely?

— Банк гатовы выдзеліць суму, якая пакрывае 90 % кошту набытага аўтамабіля з улікам плацежаздольнасці заяўніка, — растлумачылі ў фінансавай установе.


## ИЗМЕНЕНИЯ В ДОПОЛНЕНИЯ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «НикаПроект»,

*опубликованной в газете «Звязда» от 26.02.2021 г.,*

**по объекту: «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр. Жукова в г. Минске»**

**3-я очередь строительства 3-7-я секции**

Застройщик: **Общество с ограниченной ответственностью «НикаПроект»,** зарегистрированное в ЕГР 22.03.2011 за № 191581623.

Местонахождение: г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 155, оф. 810, тел. +375 29 647 70 00.

**Характеристика объекта строительства:** Проектной документацией предусматривается строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 89,56 кв. м, расположенного в 6-й секции на 3-м нежилом этаже, с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр. Жукова с уровня земли и встроенного нежилого помещения общей площадью 89,07 кв. м, расположенного в 7-й секции на том же жилом этаже, с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр. Жукова с уровня земли.

Высота помещений составляет 2,85 метра. Встроенные помещения изолированы от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери – витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяются навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-ей очереди.

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается офисное помещение по цене за 1 кв. м, эквивалентной 1584 долларов США.**

**Характеристика объекта строительства:** Проектной документацией предусматривается строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 45,61 кв. м, расположенного в 6-й секции на 3-м нежилом этаже, с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр. Жукова с уровня земли и встроенного нежилого помещения общей площадью 45,10 кв. м, расположенного в 7-й секции на том же жилом этаже, с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр. Жукова с уровня земли.

Высота помещений составляет 2,85 метра. Встроенные помещения изолированы от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери – витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяются навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-й очереди.

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается офисное помещение по цене за 1 кв. м, эквивалентной 1905 долларов США.**

Встроенные помещения передаются с черновой внутренней отделкой: штукатурка стен, стяжка пола. Система отопления встроенных помещений выполняется отдельно от системы отопления жилого дома, с установкой индивидуального прибора учета тепла. Отопление водяное, предусмотрена разводка, отопительные приборы. Система вентиляции встроенных помещений – приточно-вытяжная механическая и частичная естественная вентиляция (приток) с механической вытяжкой. Водоснабжение встроенных помещений – от отдельной системы водопровода низкого давления с установкой индивидуальных приборов учета потребляемой воды, предусмотрена установка и подключение унитазов.

Электроснабжение: предусмотрена установка вводно-распределительных щитков. От каждого вводно-распределительного щитка предусмотрено подключение оптического модема, системы вентиляции, щитка пожарной сигнализации, дополнительно предусмотрен резерв.

Общая суммарная выделенная электрическая мощность на помещения общественного назначения составляет 220 кВт. Проектом предусмотрена техническая возможность подключения потребителей 5-20 кВт в зависимости от площади помещения и его функционального назначения. Связь и сигнализация: установка оптического распределительного устройства для предоставления услуг связи РУП «Белтелеком». Встроенные помещения оборудуются автономной неадресной системой пожарной сигнализации и системой оповещения с выводом на пульт диспетчеризации МЧС. По соглашению сторон отдельные виды работ могут не выполняться.

**Условия оплаты:**

- при условии единовременной оплаты стоимости объекта долевого строительства расчет должен быть произведен дольщиком в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта либо иные условия его оплаты.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
24 верасня 2025 г. № 35 (816)



НА КАНТРОЛІ

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ЗАХАВАННЕ ЗДАРОЎЯ ГРАМАДЗЯН

## Праблема спажывання вэйпаў будзе вырашана комплексна

**У Савеце Рэспублікі адбылася пашыраная нарада па пытанні ўдасканалення прававога рэгулявання пытанняў абароту і выкарыстання (спажывання) электронных сістэм курэння і вадкасцяў для іх. Да сенатараў рэгулярна паступаюць звароты, якія датычацца забароны курэння вэйпаў, прыняцця мер, накіраваных на супрацьдзеянне фарміраванню ў дзяцей і падлеткаў шкоднай звычкі.**

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава падкрэсліла, што належнае прававое рэгуляванне ў гэтай сферы — наспелая мера, накіраваная на фарміраванне здаровай нацыі і абарону грамадзян.

Доўгі час лічылася, што электронныя сістэмы курэння менш небяспечныя для арганізма, чым звычайныя цыгарэты. Аднак вадкасці да вэйпаў утрымліваюць нікацін, фармальдэгід, канцэрагены, чым наносяць шкоду здароўю грамадзян. Зніжэнне канцэнтрацыі ўвагі, узмацненне трывожнасці, пашкоджанне ДНК, павышэнне рызык развіцця раку, інфаркту, дэпрэсіі, фарміраванне стойкай залежнасці — вось няпоўны пералік наступстваў выкарыстання вэйпаў. Гэта не проста прадмет абмеркавання з пазіцыі аховы здароўя ці эканомікі. Гэта тэма, якая выходзіць на ўзровень нацыянальнай бяспекі і дэмаграфічнай устойлівасці краіны.

На нарадзе, у якой узялі ўдзел члены прэзідыума Савета Рэспублікі, кіраўнікі зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў, падрабязна абмеркавалі канцэптуальныя палажэнні адпаведнага законапраекта. Сярод іх — строгае абмежаванне месцаў продажу, забарона рэкламы, адкрытай выкладкі электронных сістэм курэння і вадкасцяў для іх, а таксама іх узораў і спажывецкай упакоўкі, продажу ў інтэрнэце, продажу фізічнымі асобамі, уключаючы індывідуальных прадпрымальнікаў. Дадзеная праблема будзе вырашана комплексна. Усе магчымыя меры для абароны жыцця і здароўя беларусаў, асабліва дзяцей і моладзі, будуць прыняты.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# «ПРАЦУЕМ РАЗАМ НА КАРЫСЦЬ РОДНАЙ КРАІНЫ»

## Дэпутат Сяргей РАЧКОЎ — аб асаблівасцях Васняцоўскай выбарчай акругі № 93

**Старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Сяргею Рачкову як карэннаму мінчаніну добра знаёмыя кожны куток Заводскага і Ленінскага раёнаў беларускай сталіцы, частка якіх ахоплівае Васняцоўскую выбарчую акругу № 93. За плячыма ў дэпутата маецца і досвед у выкладчыцкай дзейнасці, і работа ў банкаўскай сістэме... Парламентарый з'яўляецца кадравым дыпламатам, займаецца знешнепалітычнай, знешнеэканамічнай дзейнасцю. Яго дэвіз па жыцці: «Паважаць мінулае, клапаціцца пра сучаснасць, разам будаваць будучыню!» З улікам камісіі, якую ўзначальвае народны выбраннік, выбудавана і работа ў акрузе. У першую чаргу ўвага ўдзяляецца рабоце з людзьмі, інфармаванню грамадзян аб унутранай і знешняй палітыцы нашай краіны. Пра тое, па якіх яшчэ прыярытэтных кірунках вядзе сваю дзейнасць дэпутат, а таксама пра асаблівасці работы з выбаршчыкамі ён расказаў карэспандэнту «Звязды».**



### ЖЫВАЯ КАМУНІКАЦЫЯ З ЛЮДЗЬМІ — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

— Лічу гэта найбольш эфектыўнай формай узаемадзеяння з выбаршчыкамі, якіх, дарэчы, у Васняцоўскай выбарчай акрузе № 93 пражывае звыш 70 тысяч, — адзначыў Сяргей Рачкоў. — Заводскі раён адрозніваецца ад іншых раёнаў горада Мінска, паколькі тут у асноўным пражываюць людзі, занятыя ў рэальным сектары эканомікі. Гэта грамадзяне, якія асабліва цэняць справядлівасць і праўду, гатовыя актыўна ўступіць у дыялог. Я люблю кантактаваць. Рэгулярна праводжу прыёмы грамадзян, на якія, дарэчы, стала прыходзіць не так шмат людзей. Нядаўна прыняў удзел у пасяджэнні адміністрацыі Заводскага раёна, дзе абмяркоўваліся вынікі работы са зваротамі грамадзян. Адзначу, што апошнім часам зніжаецца ў тым ліку і колькасць паўторных зваротаў. Гэта сведчыць перш за ўсё аб тым, што мясцовыя органы ўлады сталі нашмат лепш працаваць, больш якасна вывучаць патрэбы нашых людзей і больш эфектыўна рэагаваць на іх просьбы.

Усяго з пачатку гэтага года атрымаў больш за 20 пісьмовых зваротаў, правёў 16 прамых тэлефонных ліній, 84 сустрэчы з працоўнымі калектывамі і насельніцтвам па месцы жыхарства. Бывае, прыходзяць людзі з канфліктнымі сітуацыямі, але ў выніку ўсе праблемы вырашаем.

Актыўна ўзаемадзейнічаю з калегіяльнымі органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КОТГС). Мною быў праведзены шэраг сустрэч з кіраўніцтвам, на якіх абмяркоўвалі сумесныя планы і формы работы ў далейшым. Удзяляем час і надзённым праблемам, якія пасля транслірую іх кіраўніцтву Заводскага раёна і сталіцы ў цэлым.

Належная ўвага ўдзяляецца і рабоце з моладдзю. Часта наведваю студэнцкія калектывы, удзельнічаю ў дыялогавых пляцоўках, камунікую з прафесарска-выкладчыцкімі саставамі. Ведаю, якія праблемы сёння хвалююць падрастаючае пакаленне і прадстаўнікоў сістэмы адукацыі. Рэгулярна ўзаемадзейнічаю са школьнікамі, расказваю ім аб унутранай і знешняй палітыцы нашай дзяржавы. Ім гэта цікава. Маладыя людзі, напэўна, потым расказваюць пра нашы сустрэчы сваім бацькам — маім выбаршчыкам.

І гэта дае свой вынік. У прыватнасці, калі праводзім маніторынг цэн у крамах, размаўляю з пакупнікамі. Калі прадстаўляюся, многія кажуць, што ведаюць мяне, праінфармаваныя аб дзейнасці, якой займаюся.

### ШТО ХВАЛЮЕ ЛЮДЗЕЙ?

— Назіраецца пэўная ўзаемасувязь паміж той камісіяй, якую я ўзначальваю, і пытаннямі, з якімі звяртаюцца выбаршчыкі, — падкрэсліў суразмоўца. — Нямала пытанняў паступае ад людзей адносна міжнародных адносін. Беларусаў хвалююць тэмы міру і вайны, міжнароднага становішча нашай краіны, сітуацыя вакол Беларусі. У цэнтры ўвагі застаецца канфлікт паміж Расіяй і Украінай. Апошнім часам асабліва адчуваецца, што наша грамадская самасвядомасць становіцца больш сталай, людзі неабыякава ставяцца да сучаснасці і будучыні сваёй краіны. У тым ліку, напэўна, дзякуючы дзейнасці інфармацыйных груп дэпутатаў.

Як прыклад, нядаўна грамадзянка звярнулася да мяне з наступнай просьбай: жанчына хацела, каб інфармацыя пра яе бацьку — удзельніка Вялікай Айчыннай вайны — была ўнесена ў «Кнігу памяці». Мы гэта пытанне паспяхова вырашылі. Вось яшчэ прыклад: у грамадзянкі ўзніклі пытанні наконт добраўпарадкавання пахавання ў Маскве. Я сарыентаваў, па якім алгарытме ёй варта дзейнічаць. У выніку мінчанка засталася задаволена і нават пісьмова падзякавала за якасную сумесную работу.

Што датычыцца заканатворчасці, канструктыўныя прапановы грамадзян знаходзяць адлюстраванне ў праектах законаў. І яны датычацца не толькі міжнароднай дзейнасці. Існуе такая форма работы, як вывучэнне тэматычных пытанняў у выбарчай акрузе. Зыходзячы з гэтага, складаецца выніковы дакумент, які ўносіцца ў профільную камісію Палаты прадстаўнікоў для далейшага выкарыстання пры падрыхтоўцы законапраектаў.

Нядаўна, напрыклад, педагагічнай грамадскасцю Заводскага раёна вывучалася Палажэнне Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Затым меркаванні былі перададзены ў профільную камісію Палаты прадстаўнікоў, а ў далейшым выкарыстоўваліся пры яго абмеркаванні і дапрацоўцы. На этапе падрыхтоўкі таго ці іншага законапраекта мы імкнёмся вывучыць меркаванні тэматычных экспертаў у сваіх акругах для таго, каб дакументы найбольш поўна адлюстроўвалі бягучую сітуацыю.

**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Торги проводятся 24.10.2025** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**
**Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

| № лота | Местонахождение земельного участка; кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма затрат на организацию и проведение торгов, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Войровка, ул. Солнечная, 5; 624484001601000205** | 0,1741 | Подъездные пути в песчано-гравийном исполнении. Водопровод – сети водоснабжения отсутствуют. Электроснабжение – техническая возможность подключения к сети ВЛ-0,4кВ, разрешенная к использованию мощность – 4 кВт. Сети газоснабжения отсутствуют | 20 000,00 | 2 000,00 | 2 446,38 + стоимость размещения в СМИ и БУТБ |
| 2 | **аг. Сергеевичи, ул. Советская, 36; 624484007701000373** | 0,1500 | Имеются подъездные пути местного значения(асфальтированное покрытие). Имеется техническая возможность подключения к сетям электроснабжения (разрешенная к использованию мощность – 6кВт), сети водоснабжения | 11 070,00 | 1107,00 | 3 173,25 + стоимость размещения в СМИ и БУТБ |

**Продавец: По лоту 1, 2 –** Новопольский сельский исполнительный комитет, 222845, Минская область, Пуховичский район, аг. Новополье, ул. Центральная, д. 21; тел.: 8 (01713) 30-316, 80295460671.

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 21.10.2025 до 15.00.

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ___ по заявлению № ___.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Сроки возмещение затрат на организацию и проведение торгов:** Победитель электронных торгов (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах торгов обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, иные платежи, указанные в протоколе.

**Сроки и условия заключения договора:** не позднее 2 рабочих дней после представления копий платежных документов о возмещении вышеназванных затрат, иных платежей, указанных в протоколе о результатах торгов, а также внесения платы за земельный участок, продаваемый в частную собственность, или за право заключения договора аренды земельного участка, победитель электронных торгов (претендент на покупку) получает выписку из решения об изъятии земельного участка или заключает договор аренды земельного участка.

***Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов подлежат возмещению в порядке, предусмотренном в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь 1 апреля 2014 г. № 298 «Об утверждении положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку»***

# СМАЧНА!

## «НАВАТ ДОМА ТАК СМАЧНА НЕ КОРМЯЦЬ»

Школьнікі таксама прычыняюцца да кухонных спраў. Для выхавання ў дзяцей навыкаў накрываць стол, прыбіраць яго пасля прыняцця ежы практыкуецца дзяжурства па сталовай. Школьнікі па чарзе нясуць тут вахту.

*Наколькі дзецям падабаецца сталовая, карэспандэнт «Звязды» пацікавілася непасрэдна ў іх. Прагучаў званок, і дзятва пабегла падсілкавацца. Пакуль мылі рукі, пазнаёмілася з трэцякласніцай Кірай. Яна прыязджае на ўрокі з Вайніл. Дзяўчынка прызналася, што нават дома так смачна не кормяць. І вельмі ёй даспадобы школьная піца. Ксюша Каранькова з Гарбавіч дадала, што акрамя піцы любіць боршч у выкананні школьных кухараў, бульбу і ўсё астатняе.*

*Дарэчы, у школе ёсць магчымасць не толькі смачна паесці, але і навучыцца добра гатаваць. Гэтаму вучыць дзяўчат на ўроках працоўнага навучання настаўніца Алена Раманава.*

— Грамадска карысная работа, якая прысутнічае ў адукацыйным працэсе, заклікана выхаваць у дзяцей працавітасць, імкненне да стваральнай працы, творчую ініцыятыву. Мы ў свой час і падлогу ў класе мылі. Тэхперсанал абслугоўвае толькі агульную тэрыторыю. Кіраўнік дзяржавы вельмі правільна адзначае, што чалавека трэба прывучаць да грамадскай карыснай працы з дзяцінства, — гаворыць Аксана Раманава.

Сёння Гарбавіцкую школу наведвае 133 чалавекі з улікам выхаванцаў дзіцячага садка. Дзеці прыязджаюць з 10 населеных пунктаў. Яны ў школе амаль цэлы дзень, і для іх здароўя вельмі важна атрымліваць гарачую ежу. Комплексны абед каштуе да трох рублёў.

— Мы ні ў чым не адстаём ад гарадскіх школ, — кажа дырэктар. — Але ў нас яшчэ і ўтульна, як дома. Дзяцей менш, і кожны з іх на вачах. У гарадах у асноўным буфеты. Я лічу комплекснае харчаванне найлепшым. Там ёсць суп. Дома гэту страву ўжо мала хто гатуе.







### У тэму

**Вольга Гурынава, галоўны спецыяліст аддзела па адукацыі Чавускага райвыканкама:**

— Школьнае харчаванне — адзін з важных складнікаў здароўя нашых дзяцей. У апошнія гады адбыліся вялікія змены ў арганізацыі харчавання. Значны ўпор робіцца на перавагі дзяцей. Праводзіцца анкетаванне, і на яго аснове складаецца двухтыднёвае меню, куды ўключаюцца стравы беларускай кухні. Там ёсць і дранікі, якія дзеці любяць, і пельмені, і смажанкі. Як след павялічыўся працэнт дзяцей, якія харчуюцца ў школьнай сталовай. Без тэхналагічнага абсталявання, якое штогод абнаўляецца, складана было б прыгатаваць тое, што патрэбна. Але мы адсочваем гэта, развіваемся і рухаемся наперад. На жаль, сёння шмат дзяцей з лішняй вагой, іншымі захворваннямі, якія звязаны з няправільным харчаваннем. Калі не выхоўваць культуру харчавання з маленства, праблема будзе толькі павялічвацца. Мы ж павінны гэта прадухіліць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**
*Чавускі раён.*


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Гомельский завод пусковых двигателей имени П. К. Пономаренко», Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, д. 150 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/21, 150/22, 150В, 150, 150/20

**Здание заправочной склада ГСМ** с инв. № 350/С-204136, общ. пл. 35,5 кв. м (в состав входит ж/б островок под колонками, три резервуара, 17 шт. емкостей), **открытый склад металла** с инв. № 350/С-204137, общ. пл. 3 203,7 кв. м (в состав входит площадка, подкрановые пути козлового крана (2 шт.), ограждение, двое ворот, склад), **склад лакокрасок, ГСМ** с инв. № 350/С-210707, общ. пл. 186 кв. м, **автомобильная дорога на территории** с инв. № 350/С-209431, общ. пл. 40 кв. м, **ангар участка нестандартного оборудования** с инв. № 350/С-206388, общ. пл. 369,1 кв. м. (в состав входит площадка, три ограждения, ворота).
**Сведения о земельных участках:** предоставлены на праве постоянного пользования: **1** – общ. пл. 0,8037 га для содержания и обслуживания открытого склада металла с участком лакокрасок и ГСМ; **2** – общ. пл. 0,0262 га для строительства и обслуживания подъездной автомоб. дороги к кап. строениям; **3** – общ. пл. 0,4458 га для содержания и обслуживания здания ангара участка нестандартного оборудования

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 1 983 096,00 бел. руб.** (снижена на 10 %)

**Лот № 2**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/17, 150/16, 150

**Здание специализированное обрабатывающей промышленности (участок механической обработки)** с инв. № 350/С-167815, общ. пл. 837,1 кв. м, **цех безрельсового транспорта** с инв. № 350/С-75350, общ. пл. 569,8 кв. м, **автомобильная дорога на территории** с инв. № 350/С-209428, общ. пл. 93 кв. м.
**Сведения о земельных участках:** предоставлены на праве постоянного пользования: **1 –** общ. пл. 0,6481 га для содержания и обслуживания здания специализ. транспорта, складов; **2 –** общ. пл. 0,0864 га для строительства и обслуживания подъездной автомоб. дороги к кап. строениям

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 1 356 513,61 бел. руб.** (снижена на 5 %)

**Лот № 3**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150, 150/16, 150-1

**Корпус опытно-промышленного производства сорбентов** с инв. № 350/С-107542 общ. пл. 2311,3 кв. м, **Автостоянка № 2** с инв. № 350/С-107541 общ. пл. 1812 кв. м, **Зарядная станция** с инв. № 350/С-56078 общ. пл. 172 кв. м. **Помещение транспортного назначения** с инв. № 350/D-182492 общ. пл. 294,9 кв. м. **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,4858 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания корпуса опытно-промышленного производства сорбентов с прилегающими боксами, зарядной станцией, автостоянкой

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 857 106,88 бел. руб.** (снижена на 5 %)

Шаг аукциона: 5 % от текущей цены.
С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с (BYN) BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **2 %** от цены продажи лотов №№ 1–2, **3 %** от цены продажи лотов № 3 в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.09.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 08.10.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **07.10.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37, +375 29 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** |

ТУРЫЗМ

# БЕЛАРУСЬ ГАСЦІННАЯ

## Наша краіна сёлета стала яшчэ больш прывабная для турыстаў

**Бягучы год стане самым паспяховым для беларускага турызму. Гэта відаць найперш па запаўненні ўсіх сродкаў размяшчэння, у тым ліку гасцініц, санаторыяў, аграсядзіб і нават прыватных кватэр, паколькі вырас паток не толькі арганізаваных, але і індывідуальных турыстаў. Найбольшая колькасць гасцей прыязджае да нас з Расіі, але нямала іх з Прыбалтыкі (дзякуючы бязвізаваму ўезду) і іншых краін ЕС, а таксама краін СНД. Павелічэнне колькасці маршрутаў нацыянальнай авіякампаніі «Белавія» таксама спрыяе прыросту турыстаў. Гэта дае штуршок для трансфармацыі праграмы «Беларусь гасцінная», у тым ліку нядаўна быў абноўлены лагатып Нацыянальнага агенцтва па турызме, у аснове якога кветка сімвалу нацыянальнага гастратурызму — бульбы.**

### РЭКОРДНЫ ГОД

Як нагадала **дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Ірына ВАРАНОВІЧ**, кіраўнік дзяржавы адзначаў, што турызм павінен стаць сапраўдным нацыянальным брэндам. Яго трансфармацыя пачалася яшчэ ў 2020 годзе, калі кожная краіна фіксавала павышаную ўвагу да ўнутранага турызму. Улічваючы гэта, у Беларусі было шмат зроблена і яшчэ варта зрабіць у галіне інфраструктуры і прыцягнення інвестыцыйных праектаў. Але і з улікам ужо рэалізаванага сёлетні год абяцае стаць самым паспяховым, пераўзышоўшы паказчыкі самага выніковага дагэтуль 2019-га.

Спрыяюць актыўнасці саміх беларусаў і рэспубліканскія мерапрыемствы, у прыватнасці, турыстычны конкурс «Пазнай Беларусь» і акцыя «Вандруй. Адчуй. Натхняйся». Узнікненню апошняй спрыяла цікавасць з боку беларусаў і замежнікаў да дня адкрытых дзвярэй, які праводзілі некаторыя турыстычныя аб'екты, у выніку ў 2022 годзе было вырашана яго адначасова правесці ўсюды, дзе пажадаюць запрасіць да сябе гасцей. І калі падчас першай акцыі «Вандруй. Адчуй. Натхняйся» ўдзельнічала 516 аб'ектаў турызму, якія наведала амаль 24,5 тысячы чалавек, то сёлета ў 1413 аб'ектаў завітала больш за 178 тысяч турыстаў.

### ЗНАЁМАЕ — ПА-НОВАМУ

Рэкордная колькасць заявак паступіла сёлета і на ўдзел у рэспубліканскім конкурсе сацыяльнай рэкламы «#ПазнайБеларусь» — 2 231, паведаміў **дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый МАРОЗАЎ**. Самая папулярная намінацыя — «Слоган», тут сабрана звыш 1,4 тысячы заявак, акрамя таго на конкурсе заяўлены намінацыі «Плакат» і «Відэаролік» (падналмінацыі «Відэаролік арганізацыі» і «Відэаролік падарожніка»). Прапанаваныя варыянты будуць выкарыстоўвацца для работы ў сацыяльных сетках, каб далей праcоўваць падарожжы па роднай краіне. Акрамя таго, іх можна будзе ўбачыць на білбордах.

Як расказаў мінулагодні пераможца конкурсу «Пазнай Беларусь» у намінацыі «Плакат» Данііл Папруга, калі ён глядзеў работы ўдзельнікаў конкурсаў папярэдніх гадоў, для сябе адзначыў іх высокі прафесійны ўзровень.

— Для мяне перамога ў конкурсе — гэта найперш адказнасць натхняць людзей на падарожжа па сваёй краіне. На маім плакаце — не абстрактныя пейзажы, а месцы, дзе мне давялося пабываць, — дадаў пераможца.

Сёлетняя цырымонія ўзнагароджання пераможцаў адбудзецца 26 верасня падчас V Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Перспектывы развіцця турызму ў сучасных умовах: сусветныя тэндэнцыі і рэгіянальныя кантэксты», прымеркаванай да Сусветнага дня турызму.

Як падкрэсліў Дзмітрый Марозаў, «Пазнай Беларусь» — гэта платформа для творчай самарэалізацыі, дзе кожны можа выказаць сваю любоў да Беларусі праз сацыяльную рэкламу. Мэта конкурсу — натхніць людзей на падарожжы па роднай зямлі, адкрыць для сябе нязведаныя маршруты і ўбачыць знаёмыя мясціны па-новаму.

### КВЕТКА БУЛЬБЫ

А вось у цэнтры абноўленага лагатыпа Нацыянальнага агенцтва па турызме — кветка бульбы. Менавіта яна перамагла ў галасаванні ў тэлеграм-канале агенцтва.

— Большасць апытаных менавіта ў ім адчула штосьці роднае, — адзначыў Дзмітрый Марозаў, дадаўшы, што пялёсткі кветкі сімвалізуюць усе рэгіёны нашай краіны. Больш за тое, гэта сімвал гастранамічнага турызму Беларусі — многія замежныя госці пры наведванні просяць пакаштаваць менавіта беларускія дранікі. Акрамя таго, лагатып мае адсылку яшчэ да аднаго сімвала Беларусі — папараць-кветкі.

— У краіне вельмі шмат робіцца для развіцця турызму. Адкрываюцца новыя аб'екты, сядзібныя комплексы, рэстаўрыруюцца замкі. Прыродаахоўныя ўстановы арганізуюць новыя цікавыя экскурсіі, паходы, маршруты. Удасканальваецца якасць аказваемых паслуг. Каласальная работа праводзіцца ў рэгіёнах, распрацоўваюцца тэматычныя сайты, ствараюцца групы ў сацыяльных сетках, рыхтуюцца маршруты, каб прыцягваць як беларускіх, так і замежных турыстаў, — рэзюмаваў Дзмітрый Марозаў.

**Алена КРАВЕЦ.**




## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Экзито прайм»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2084 | Цистерна 25 м.куб., инв № 92 | 900,00 | 90,00 | 45,00 |
| 2085 | Емкость 25 м.куб., инв. № 93 | 900,00 | 90,00 | 45,00 |
| 2086 | Автомобиль Нива 21214, рег. знак. 4577 ВР-2, кузов (рама) XTA212140A1961702, 2010 г. вып., инв. № 73 | 2124,00 | 212,40 | 106,20 |
| 2089 | Машина для внес. орган. удобрен. ПРТ-7А, инв. № 85 (без док.) | 2124,00 | 212,40 | 106,20 |
| 2091 | Полуприцеп ПС-45, инв. № 296 (без док.) | 2412,00 | 241,20 | 120,60 |
| 2092 | Полуприцеп ПС-45, инв. № 297 (без док.) | 2412,00 | 241,20 | 120,60 |
| 2304 | Автокар протравитель семян ПС-10, инв. № 384 (без док.) | 3780,00 | 378,00 | 189,00 |
| 2305 | Агрегат посевной Lemken Saphir, инв. № 385 (без док.) | 26784,00 | 2678,40 | 1339,20 |
| 2306 | Бочка алюминиевая для молока 500 л., инв. № 386 | 507,60 | 50,76 | 25,38 |
| 2307 | Весы для скота, инв. № 387 | 1047,60 | 104,76 | 52,38 |
| 2308 | Водораздатчик БУ-ЗА, инв. № 388 | 1836,00 | 183,60 | 91,80 |
| 2309 | Водораздатчик БУ-ЗА, инв. № 389 | 1836,00 | 183,60 | 91,80 |
| 2310 | Емкость для молока из нержавеющей стали для установки УМ-1, инв. № 390 | 5292,00 | 529,20 | 264,60 |
| 2311 | Машина для внесения органических удобрений ПРТ-7А, инв. № 391 (без док.) | 8424,00 | 842,40 | 421,20 |
| 2312 | Полуприцеп одноосный тракторный, инв. № 392 (без док.) | 3996,00 | 399,60 | 199,80 |
| 2313 | Прицеп тракторный, инв. № 393 (без док.) | 5076,00 | 507,60 | 253,80 |
| 2314 | Прицеп трехосный тракторный для перевозки сена, инв. № 394 (без док.) | 7668,00 | 766,80 | 383,40 |
| 2315 | Прицеп-бочка для питьевой воды, инв. № 395 (без док.) | 1296,00 | 129,60 | 64,80 |
| 2316 | Установка молокоохладительная УМ-4 4400 литров, инв. № 396 | 10584,00 | 1058,40 | 529,20 |
| 2317 | Цистерна полуприцеп МЖТ-10, инв. № 397 (без док.) | 5184,00 | 518,40 | 259,20 |
| 2318 | Опрыскиватель для ядохимикатов с/х прицепной, инв. № 398 (без док.) | 9072,00 | 907,20 | 453,60 |

В отношении лотов №№ 2084-2086, 2089, 2091, 2092 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 70 %.** В отношении лотов №№ 2304-2318 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 16.08.2025

**Местонахождение:** Витебская обл., Браславский р-н, аг. Межаны

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **7 октября 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 24 сентября 2025 года до 16.00 3 октября 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Экзито прайм», проводимых 07.10.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 2084, 2085, 2306 – 10 %, по лотам №№ 2086, 2089, 2091, 2092, 2304, 2307–2309, 2312, 2315 – 9 %, по лотам №№ 2310, 2311, 2313, 2314, 2317, 2318 – 8 %, по лотам №№ 2305, 2316 – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения (подписания) договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.
Дополнительная информация по предмету торгов – по тел. **+375 (29) 308-27-62, Екатерина**.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375 (29) 304-25-60, Андрей (пн – пт с 09.00 до 18.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Общество с ограниченной ответственностью «Экзито прайм» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. 8 (029) 576 77 15, kp@p-k.by (211969, Республика Беларусь, Витебская обл., аг. Межаны, ул. Школьная, д. 1, УНП 391883426)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

СУАЙЧЫННІКІ

# ТРЭБА ДОМА БЫВАЦЬ...

## У гэтым упэўнены нашы суайчыннікі, якія сёння жывуць у розных краінах свету



**На Радзіму яны прыязджаюць па веды, звязаныя з культурай і традыцыямі. У Мінску праходзіць творчая стажыроўка для беларусаў замежжа. У ёй бяруць удзел нашы суайчыннікі з Расіі, Казахстана, Латвіі, Літвы, Італіі.**

На працягу тыдня госці паўдзельнічаюць у майстар-класах па саломапляценні, стварэнні паясоў, па ручной набіванцы па тканіне, роспісе па шкле, ганчарстве, мастацкай апрацоўцы дрэва. Яны пазнаёмяцца з майстрамі з Мінска і Бярозы, пабываюць у музеі маляванкі ў Заслаўі. У праграме таксама — наведванне памятных месцаў і экскурсіі на беларускія прадпрыемствы.

Творчыя стажыроўкі для беларусаў замежжа, якія праводзіць Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, праходзяць з 2016 года. Прыязджаюць кіраўнікі грамадскіх аб'яднанняў, а таксама тыя, хто шмат робіць для папулярызацыі беларускай культуры ў краінах пражывання. Запатрабаванымі сталі тэматычныя праграмы, калі на занятках у Беларусі прадстаўнікі творчых калектываў змогуць атрымаць вопыт і ідэі, якія выкарыстаюць падчас работы. Ужо праводзіліся сустрэчы для спевакоў і харэографаў. У верасні стажыроўка накіравана на паглыбленае вывучэнне рамёстваў і промыслаў, таму сярод яе ўдзельнікаў ёсць майстры, якія працуюць з рознымі матэрыяламі. Напрыклад, сярод прадстаўнікоў беларусаў Камчаткі — майстар разьбы па дрэве, з Башкартастана прыехала жанчына, якая вырабляе аўтарскія лялькі, з Латвіі — прадстаўнікі гуртка «Зробім разам», дзе вучаць рабіць каларытныя сувеніры.

Сёння прадстаўнікі беларускай дыяспары часта спалучаюць розныя заняткі. Тыя ж вышывальшчыцы і майстры саломапляцення могуць займацца ў вакальных і танцавальных калектывах, весці пошукавую работу, звязаную з гісторыяй перасяленцаў і захаваннем памяці пра Вялікую Айчынную вайну.


Фота БелТА.

Старшыня рэгіянальнай грамадскай арганізацыі «Беларусы Башкартастана» Раіса Зюзько, якая прыехала з Уфы, расказала пра сяло Балтыка ў Іглінскім раёне, дзе пражывае 700 беларускіх сямей. Там ёсць уласныя садок, школа, Дом культуры. На факультатыўнай аснове ў дзіцячых установах выкладаецца беларуская культура. Дзякуючы намаганням грамадскага аб'яднання працуе беларуская хата — музей, абсталяваны ў стылі XIX стагоддзя. Для яго збіраюцца экспанаты, звязаныя з беларускімі перасяленцамі, некаторым з рэчаў больш за сто гадоў. У беларускай хатцы знаходзіцца сапраўдная печка, і тут можна праводзіць не толькі фальклорныя вечары і экскурсіі, але і смажыць бульбу, рабіць дранікі. Калі ў Балтыку прыязджаюць госці, у іх ствараецца ўражанне, што трапілі ў Беларусь, бо нашы суайчыннікі дамы будуюць так, як было прынята на радзіме, а ў хатах прадстаўнікоў старэйшага пакалення яшчэ і сёння можна пабачыць ручнікі, дыванкі і нават калыскі. Турыстычны маршрут па Іглінскім раёне прызнаны адным з найлепшых у Расійскай Федэрацыі для прадстаўнікоў сталага ўзросту. Увогуле, у Башкартастане дзейнічае праграма «актыўнага даўгалецця», у рамках якой кожны пенсіянер можа паўдзельнічаць у экскурсіях як па сваёй краіне, так і па Беларусі (праезд аплачваецца дзяржавай). Па словах Раісы Зюзько, у Беларусь на працягу года можа накіроўвацца каля 9 груп пенсіянераў, і многія нашы суайчыннікі ўжо скарысталіся гэтай магчымасцю. Башкартастан актыўна развівае эканамічныя і культурныя сувязі з Беларуссю, прадстаўнікоў дыяспары заўсёды запрашаюць на адкрыццё сумесных прадпрыемстваў.

Таксама беларусы Башкартастана шмат робяць для захавання памяці пра герояў Вялікай Айчыннай вайны. Сёння яны працуюць над стварэннем базы «Фронт у тыле ворага» — збіраюць інфармацыю пра ўраджэнцаў Башкірыі, якія ўдзельнічалі ў партызанскім і падпольным руху.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
### по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

**Организатор электронных торгов:** Туринский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, аг. Турин, ул. Центральная, 49Б, тел.: (801713) 98635, 43296, 8 (029) 7503249.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by. Дата проведения электронных торгов: **27 октября 2025 г.**
**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес объекта, характеристики | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, *руб.* | Задаток, *руб.* | Расходы по подготовке, *руб.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | **Минская область, Пуховичский р-н, д. Шкавиловка, уч. 24 Г** | 624487910101000098, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,2128 | Сети электроснабжения, газоснабжения | 5 450,00 | 545,00 | Затраты на организацию и проведение электронных торгов 2972,61 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки |
| 2. | **Минская область, Пуховичский р-н, аг. Турин, ул. Центральная, уч. 29А** | 624487909101000302, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,2017 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 13 800,00 | 1 380,00 | Затраты на организацию и проведение электронных торгов 3 475,92 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки |
| 3. | **Минская область, Пуховичский р-н, аг. Ситники, ул. Солнечная, уч. 6** | 624487907801000313, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1287 | Сети электроснабжения, газоснабжения | 9 000,00 | 900,00 | Затраты на организацию и проведение электронных торгов 2766,40 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки |

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **22 октября 2025 года, до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предмета торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

## ООО «СидНеА» организует конкурсные торги

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена: сумма в белорусских рублях, эквивалентная долларам США по курсу НБ РБ на день проведения торгов | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| **Повторные конкурсные торги** | | | | | |
| **07.10.2025 11.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-7988224858, расположенной по адресу: г. Минск, ул. Николы Теслы, д. 30, кв. 19 | 88900 | 36,7 кв. м | 2500 | 90 |
| **07.10.2025 12.00** | Продажа земельного участка с кад. № 622280800002000054, по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Путчинский с/с, СТ Минского подшипникового завода «МАРА 2001», 228 | 40500 | 0,1008 га | 2500 | 90 |
| **07.10.2025 13.00** | Продажа земельного участка с кад. № 622285500101000059, с незавершенным законсервированным капитальным строением с инв. № 620/U-43406, по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, д. Антосино, ул. Дачная, 12 | 149900 | 0,0966 га | 2500 | 90 |
| **Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 180 (30568) от 18.09.2025** | | | | | |
| **03.10.2025 11.00** | Продажа капитального строения – одноэтажное блочно-кирпичное здание лесопилорамы, с кад. № 423355100001001731, с инв. № 431/С-20065, по адресу: Гродненская обл., Кореличский р-н, г. п. Кореличи, ул. Гастелло, 52К | 17000 | 1075 кв. м | 2500 | 90 |
| **Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 178 (30566) от 16.09.2025** | | | | | |
| **15.10.2025 12.30** | Продажа двухквартирного блокированного жилого дома, с кад. № 424655100001001312, с инв. № 442/С-12432, по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г. Островец, ул. Школьная, д. 3 | 150000 | 570,9 кв. м | 2500 | 90 |
| **Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 171 (30559) от 05.09.2025** | | | | | |
| **06.10.2025 11.00** | Продажа жилого дома, с инв. № 602/C1852, с кад. № 624488507601000005, по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Новопольский с/с, д. Товарские, ул. Солнечная, д. 1 | 14900 | 45,5 кв. м | 2500 | 90 |
| **29.09.2025 12.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-798821083, по адресу: г. Минск, ул. Николы Теслы, д. 8, кв. 152 | 133000 | 63,8 кв. м | 2500 | 90 |

Торги состоятся по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж.
Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращаются за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж.
Конкурсное обеспечение вноситься на р/с BY14MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22.
Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов.
Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю.
Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденным приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД.
Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов.

**Телефон для справок (+37529) 171-50-50.**

УНП 193734126

ЗАПРАШАЛЬНІК

# НЕ ПРОСТА МУЛЬЦІКІ...

## Дзе адсачыць тэндэнцыі анімацыйнага кіно?

Сёння ў Магілёве і вобласці распачнецца XXVIII Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў «Анімаёўка-2025». У рамках форуму з 24 да 26 верасня гледачоў чакае паказ конкурсных кінастужак, а таксама спецыяльныя фестывальныя праграмы з работамі ўдзельнікаў мінулых гадоў, творчыя сустрэчы з аўтарамі і майстар-класы ад прафесіяналаў індустрыі.

Сёлета, як і ў папярэднія гады, арганізатарамі — Міністэрствам культуры і Магілёўскім абласным выканаўчым камітэтам — падрыхтавана цікавая праграма. Найперш, магіляўчане і госці горада змогуць пазнаёміцца з новымі работамі айчынных і сусветных аніматараў. У рамках фестывалю праводзіцца тры конкурсы: анімацыйных фільмаў, дзіцячай анімацыйнай творчасці і конкурс дзіцячага выяўленчага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Сёлета на форуме больш за 700 удзельнікаў з 78 краін свету. За перамогу сярод анімацыйных фільмаў паспаборнічаюць 89 кінаработ, а ў конкурсе дзіцячай анімацыйнай творчасці — 92 работы. Упершыню на фестываль завітаюць прадстаўнікі анімацыйнай кінаіндустрыі з Туніса, Пакістана, Анголы, Манголіі, Іарданіі, Панамы, Камеруна, Шры-Ланкі, Бангладэша, Бахрэйна, Беніна, Гандураса. Шырока будзе прадстаўлена і Беларусь.

Пунктамі прыцягнення фестывалю ў Магілёве стануць кінатэатры «Космас», «Радзіма» і «Чырвоная зорка». Так, урачыстае адкрыццё «Анімаёўкі-2025» адбудзецца ў кінатэатры «Радзіма» днём. Але ўжо з раніцы ў фае і ў вялікай зале пройдзе адкрыццё выстаўкі работ конкурсу дзіцячага выяўленчага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Экспазіцыя будзе працаваць і ў іншых кінатэатрах горада. Пасля пачнецца конкурсная праграма фільмаў «Аніматары свету дзецям». У канферэнц-зале кінатэатра запланаваны майстар-класы «Пярнаты сябар» народнага майстра па саломапляценні Ірыны Кухцінай. Увечары ў малой зале стартуе конкурсная праграма фільмаў. Урачыстае закрыццё таксама пройдзе ў гэтай лакацыі 26 верасня днём, пасля ў праграме — дэманстрацыя фільмаў-пераможцаў.

У кінатэатры «Космас» пройдзе конкурсная праграма фільмаў дзіцячай анімацыйнай творчасці з галасаваннем гледачоў. Чакаецца таксама творчая сустрэча з расійскім рэжысёрам-аніматарам, мастаком-пастаноўшчыкам Рымам Шарафутдзінавым. У дзень закрыцця праграма фестывалю прапануе майстар-клас «STOP-MOTION і яго звышмагчымасці» ад рэжысёра-аніматара, мастака-пастаноўшчыка кінастудыі «Беларусьфільм» Таццяны Нагорскай. І, вядома, будуць паказы конкурснай праграмы і дэманстрацыя фільмаў-пераможцаў.

У кінатэатры «Чырвоная зорка» можна наведаць майстар-клас «Ілюзіён: сакрэты мантажу» рэжысёра анімацыйнага і ігравога кіно, сцэнарыста, педагога Алены Туравай.

Набыць білеты на мерапрыемствы «Анімаёўкі-2025» можна ў касах згаданых кінатэатраў і на сайце mogilevkino.by.Спяшайцеся за сваім пропускам у свет дзяцінства і мастацтва анімацыі.

**Алена ДРАПКО.**

# КЛІН ЖУРАЎЛІНЫ АДЛЯТАЕ



**Па гарызанталі: 1.** «Вераснёвы ... // Першы дзень без лета, // Песні жураўліныя льюцца на развіт». З верша Д. Пятровіча «Вераснёвы ...»; 13 верасня — Сусветны дзень жураўля. **4.** «... жураўліны адлятае, // Цяпло панеслі жураўлі». З верша А. Балуценкі «Восень». **7.** «Мая ... там, дзе мая бібліятэка». Э. Ратэрдамскі; 15 верасня — Дзень бібліятэк. **8.** Апавяданне аб праўдзівым здарэнні. **9.** Род мармеладу. **10.** Восень — ... , зіма — падбярыха (прык.). **11.** Ступень адкормленасці жывёлы. **14.** Карабельная шлюпка. **16.** Журавель — не ..., яда не наша (прык.). **17.** Хто людзей весяліць, за таго і ... стаіць (прык.). **20.** Вязкі асадак на дне вадаёмаў. **21.** Казацкі афіцэрскі чын. **23.** Тое, што і дастатак; з даўніх часоў носьбітам ... лічыўся журавель. **26.** Урачысты верш. **27.** Прыстасаванне для сцёку вадкасці. **29.** Увосень жывёла тлусцее, а ... дабрэе (прык.). **30.** Народны паэт — пясняр у казахаў, кіргізаў. **31.** Дзе бусел вядзецца, там шчаслівае ... (прык.).

**Па вертыкалі: 1.** У верасні адна ягада, ды і тая горкая ... (прык.). **2.** Буйная рака ў Афрыцы. **3.** Рух на транспарце. **5.** Сырое ... і цёплая восень — да доўгай зімы (прыкм.). **6.** Кароткая аповесць ці апавяданне. **7.** Тое, што і аднойчы (прысл.). **9.** «Жураўлі на ... ляцяць». Песня (сл. А. Ставера, муз. І. Лучанка). **12.** «Як птушка, душа ўстрапянецца, // Пачуўшы ... жураўліны». З верша М. Маляўкі «Покуць». **13.** Прыгарад (устар.). **15.** ... здаецца высокім — да ветру (прыкм.). **18.** Лепш ... у руках, чым журавель у небе (прык.). **19.** Невялікая пеўчая птушка атрада вераб'іных. **22.** «І далей, на поўдзень ляцяць жураўлі, // Над імі калышуцца ...». З верша Я. Коласа «Жураўліны вырай». **24.** Плады, якія апалі ад ветру. **25.** Будынак для складання, абмалоту збожжа. **28.** ... ды вада поле ўпрыгожваюць (прык.).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі: 1.** Ранак. **4.** Клін. **7.** Радзіма. **8.** Быль. **9.** Пат. **10.** Запасіха. **11.** Напас. **14.** Ял. **16.** Каша. **17.** Свет. **20.** Іл. **21.** Есаул. **23.** Дабрабыт. **26.** Ода. **27.** Зліў. **29.** Чалавек. **30.** Акын. **31.** Месца.

**Па вертыкалі: 1.** Рабіна. **2.** Ніл. **3.** Язда. **5.** Лета. **6.** Навела. **7.** Раз. **9.** Палессе. **12.** Плач. **13.** Слабада. **15.** Неба. **18.** Сініца. **19.** Слаўка. **22.** Зоры. **24.** Апад. **25.** Ток. **28.** Лес.

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ціск | Ноччу | Днём |
|---|---|---|---|
| МІНСК | 774 мм рт.сл. | +4..+6°C | +11..+12°C |
| ВІЦЕБСК | 772 мм рт.сл. | +3..+4°C | +11..+12°C |
| МАГІЛЁЎ | 772 мм рт.сл. | +3..+6°C | +11..+13°C |
| ГОМЕЛЬ | 771 мм рт.сл. | +3..+5°C | +13..+14°C |
| ГРОДНА | 774 мм рт.сл. | +5..+6°C | +12..+13°C |
| БРЭСТ | 773 мм рт.сл. | +5..+7°C | +13..+14°C |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**

*Апошняя чвэрць 14.09.–20.09. Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

**...у суседзяў**

МАСКВА +6..+8°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +11..+12°C



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

**24 ВЕРАСНЯ** Даты Падзеі Людзі

**У краіне**

**1910** год — нарадзіўся Навум Ізраілевіч Цырульнікаў (г. Быхаў Магілёўскай вобл.), контр-адмірал (1949). У 1932 г. скончыў Вышэйшае ваенна-марское вучылішча, у 1960-м — Ваенную акадэмію Генштаба. З 1928 г. служыў у Ваенна-Марскім флоце. У 1939—1945 гг. — начальнік аператыўнага аддзела штаба Ціхаакіянскага флоту. Удзельнік вайны з Японіяй (1945). З 1947 г. — камандуючы Уладзіміра-Вольгінскай Ваенна-марской базай, у 1951—1954 гг. — камандзір дывізіі падводных лодак, у 1954—1969 гг. — на выкладчыцкай рабоце.

**1920** год — у Мінску пачаўся першы Усебеларускі з'езд камсамола (24 — 27 верасня).

**1955** год — Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР зацвердзіў тэкст і музыку Дзяржаўнага гімна Беларускай ССР (тэкст Міхася Клімковіча, музыка Нестара Сакалоўскага).

**У свеце**

**1870** год — нарадзіўся Жорж Клод, французскі інжынер, хімік, вынаходнік неонавай лямпы.

**1916** год — рускі лётчык Канстанцін Арцэулаў упершыню наўмысна выканаў «штопар» і вывеў з яго самалёт. Аналізуючы паводзіны самалёта ў штопары, калі ніякія рухі рулямі вышыні не дапамагаюць, Арцэулаў прыйшоў да высновы, што галоўная памылка пілотаў — спроба падняць нос машыны. Замест гэтага, вырашыў ён, нос трэба апусціць яшчэ мацней, накіраваўшы аэраплан перпендыкулярна зямной паверхні, і толькі пасля гэтага спрабаваць выводзіць яго ў піке. Падняўшыся на вышыню два кіламетры, ён увёў свой «Ньюпар» у штопар, зрабіў тры віткі — і з дапамогай прыдуманых ім прыёмаў беспамылкова вывеў машыну з небяспечнага манеўру. Пасля чаго паўтарыў эксперымент, зрабіў ужо пяць віткоў і зноў перапыніў штопар. З гэтага дня небяспечная з'ява больш не была смяротным прысудам пілотам, а лётчыкаў пачалі вучыць не толькі выходзіць са штопару, але і выкарыстоўваць яго ў баі як фігуру вышэйшага пілатажу.

**1970** год — упершыню ў гісторыі асваення касмічнай прасторы савецкая аўтаматычная станцыя «Месяц-16» даставіла на зямлю ўзоры месяцовага грунту.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 433. Індэкс 63850. Зак. № 1969.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 верасня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12